# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі Носік Алесі Анатольеўны
“Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне”, прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

Аўтарэферат дысертацыі А.А. Носік “Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне” дазваляе сцвярджаць, што даследаванне характарызуецца высокай ступенню актуальнасці і навізны. Праца адрозніваецца лагічнасцю, паслядоўнасцю выкладу моўнага матэрыялу, выдатным навуковым стылем і лінгвістычным кругаглядам аўтара.

Тэма, абраная даследчыцай для распрацоўкі, безумоўна, актуальная, паколькі эмоцыі як феномен, які вызначае нацыянальную спецыфіку грамадства, у жыцці чалавека адыгрываюць важную ролю. Таму ўзнікае неабходнасць правядзення лінгвістычнага аналізу моўных сродкаў, што адлюстроўваюць эмоцыі і эмацыянальны стан чалавека.

Дысертацыя, як гэта бачна з аўтарэферата, складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса і дадаткаў. У першай главе «Катэгорыя эмацыянальнасці ў сучаснай навуковай парадыгме» разглядаюцца тэарэтычныя пытанні катэгорыі эмацыянальнасці, аналізуюцца працы даследчыкаў, звязаныя з моўнай рэпрэзентацыяй эмоцый у розных мовах, а таксама з невербальнымі сродкамі выражэння і распазнавання эмацыянальных станаў. Другая глава прысвечана лексічным сродкам намінацый адмоўных эмоцый, у якой аўтар канцэнтруе ўвагу на найбольш распаўсюджаных намінацыях з інварыянтнымі значэннямі (агіды, віны, гневу, гора пагарды і г.д.) у іх узаемадзеянні з сумежнымі паняційнымі сферамі. Важна адзначыць, што колькасны склад негатыўных намінацый эмацыяльнага стану чалавека па кожнай групе прадстаўлены ў табліцы. Трэцяя глава складаецца з трох раздзелаў, у якіх разглядаюцца лексічныя сродкі намінацый станоўчых эмоцый. Аўтар звяртае ўвагу на факт асіметрычнасці станоўчых і адмоўных эмоцый, значнай перавагі адмоўных адзінак над станоўчымі і тлумачыць гэта перш за ўсё “шырокай семантыкай лексічных адзінак, іх сінкрэтычнасцю і магчымасцю спалучаць у межах адной сэнсавай структуры розныя элементы станоўчай пачуццёвай сферы без больш-менш выразных канкрэтызатараў станоўчага пачуцця” (с.11-12).

У дысертацыі эфектыўна вырашаны пастаўленыя задачы і ўпершыню ў айчынным мовазнаўстве прадстаўлена комплекснае даследаванне намінацый унутранага стану чалавека. Прыцягненне да аналізу значнай колькасці лексічных адзінак (1100), засведчаных у тэкставых фрагментах (2800), дазволіла выявіць і прадэманстраваць спецыфіку рэпрэзентацыі эмацыянальнасці, а таксама акрэсліць класіфікацыйныя тыпы найменняў пачуццёва-псіхічнай сферы.

Асаблівай увагі, на наш погляд, заслугоўвае ўпершыню створаны ў беларускай лексікаграфічнай практыцы на аснове значнага па аб'ёме рэпрэзентатыўнага фактычнага матэрыялу "Тлумачальны слоўнік намінацый эмацыянальнай сферы чалавека", што сведчыць таксама аб практычнай і сацыяльна-эканамічнай значнасці даследавання.

Як сведчыць аўтарэферат, дысертацыя прайшла належную апрабацыю, яе вынікі ў дастатковай меры адлюстраваны ў навуковым друку ў адпаведнасці з існуючымі патрабаваннямі ВАК Беларусі.

Мяркуючы па аўтарэфераце, дысертацыя А.А. Носік "Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне" адносіцца да даследаванняў, якія ўзбагачаюць уяўленні аб семантычных, структурных і функцыянальных заканамернасцях беларускага лексічнага кантынуума эмацыянальнай сферы чалавека і ўносяць значны ўклад у айчыннае мовазнаўства.

Лічу, што аўтар дысертацыі "Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне" Алеся Анатольеўна Носік заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова за:

- выяўленне, сістэматызацыю найбольш поўнага корпуса намінацый са значэннем унутранага стану чалавека і стварэнне першага ў лексікаграфічнай практыцы "Тлумачальнага слоўніка намінацый эмацыянальнай сферы чалавека";
- вызначэнне асаблівасцей функцыянавання субстантыўных, ад'ектыўных і дзеяслоўных намінацый эмацыянальных праяў;
- класіфікацыю эмацыянальных найменняў паводле іх прыналежнасці да пеяратыўнай і меліяратыўнай разнавіднасцей канатацыі;
- устанаўленне спецыфікі рэпрэзентатыўнасці пазітыўных эмоцый;
- выяўленне спецыфікі семантычнай дэрывацыі ў корпусе эмацыянальных намінацый і ўстанаўленне асноўных семантычных мадэлей утварэння другасных лексіка-семантычных варыянтаў.

Дацэнт кафедры рускай мовы
і культуры маўлення установы адукацыі
"Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь"
кандыдат філалагічных навук, дацэнт — С.І. Фацеева
10.06.2024

Подпіс Фацеевай С.І. сведчу

Начальнік аддзела кадраў УА ВА РБ — В.В. Шчарбін